Ўжо ………………… магіла:
……………… жменю ~~зёрнаў у гаршку~~ там знайшлі.
Хоць зер[нрзб]……………………
Ўсё ж такі жыцц[нрзб] …………………
………………………… ўскаласілаея
~~Вяснюю тое~~ Парой вясновай ………………..
Восьь сім[нрзб] ……………………………!
Зварушаны нарэшце дух народны,
~~Каторы ўперад моцна рвецца, імкне,~~
……………………………… не засне,
… [нрзб]рад рынецца, …………………
…………………………………….. мкне,
~~Што цераз глебу ўтрапіла прабіцца.~~
Зда[нрзб] ………………………………..

| | |
|---|---|
| 1. Аўтар гэтага верша | |
| 2. Назва верша | |
| 3. Вершаваны памер верша | |
| 4. Цвёрдая форма верша | |



Шыфр:______________________

Колькасць балаў:______________

Зацвярджаю

Намеснік старшыні
арганізацыйнага камітэта,
намеснік Міністра адукацыі
__________ Р.С.Сідарэнк

«17» [illegible] 2017 года

ЗАКЛЮЧНЫ ЭТАП XXXIII РЭСПУБЛІКАНСКАЙ АЛІМПІЯДЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ «БЕЛАРУСКАЯ МОВА»
І «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

## КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Гомель, 20*

### 11 клас

| Заданні | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 | 8 | 9 | 10 | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Балы | | | | | | | | | | | |

### Варыянт І

**Заданне 1.** З прапанаваных ніжэй гукаў (гукавых спалучэнняў) выберыце тыя, шт адпаведнасці з правіламі літаратурнага вымаўлення, павінны вымаўляцца ў прыведзен табліцы словах у месцах пропуску. Нумары выбраных гукаў (гукавых спалучэнняў) упіш ў табліцу насупраць адпаведных ім слоў.

Гукі і гукавыя спалучэнні:

1 – [*і*],
2 – [*ы*],
3 – [*й*],
4 – [*йі*],
5 – [*ый*].

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала – за кожнае правільнае рашэ

| | | | |
|---|---|---|---|
| *аб*[ ]*нець* | | *пера*[ ]*граць* | |
| *непр*[ ]*манне* | | *гука*[ ]*заляцыя* | |
| *з*[ ]*начыць* ‘зрабіць інакшым’ | | *пр*[ ]*шлы* | |
| *сан*[ ]*нспектар* | | *пра*[ ]*люстраваць* | |

**Заданне 2.** З прапанаваных ніжэй слоў, ужыўшы іх у патрэбнай граматычнай фор складзіце пяць фразеалагізмаў з кампанентам *вока*, запісаўшы іх у правым слупку табл насупраць адпаведных для ўстойлівых выразаў значэнняў.

Словы-кампаненты для складання фразеалагізмаў:

*глядзець, за, месца, мокры, на, не, пазычаць, паказваць, праўда, у, прыгожы, сабака, у.*

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

| | | |
|---|---|---|
| 1. | 'траціць сумленне, сорам, набірацца нахабнасці' | |
| 2. | 'не прыходзіць куды-небудзь, не паяўляцца дзе-небудзь' | |
| 3. | 'хто-небудзь часта плача, ці гатовы заплакаць' | |
| 4. | 'цвяроза ацэньваць сапраўднае становішча' | |
| 5. | 'бескарысліва, дарэмна, толькі з-за сімпатыі да каго-небудзь (рабіць што-небудзь)' | |

**Заданне 3.** Перакладзіце тэкст на беларускую мову.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

Пикник вышел не столько веселым, сколько крикливым и беспорядочно суматошливым. Приехали за три версты в Дубечную. Так называлась небольшая, десятин в пятнадцать, роща, разбросавшаяся на длинном пологом скате, подошву которого огибала узенькая светлая речонка. Роща состояла из редких, но прекрасных, могучих столетних дубов. У их подножий густо разросся сплошной кустарник, но кое-где оставались просторные прелестные поляны, свежие, веселые, покрытые нежной и яркой первой зеленью *(По А. И. Куприну)*.



**Узор:**

| Пачатак мастацкага твора | Нумар заканчэння мастацкага твора | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| Мой родны кут, як ты мне мілы! | 3 | «Новая зямля» | Якуб Колас |

**Спіс заканчэння мастацкага твора:**

<…>

**3.** Прасторны шлях! калі ж, калі / Ты закрасуеш на зямлі / І злучыш ўсе нашы дарогі?

<…>

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

| Пачатак мастацкага твора | Нумар заканчэння мастацкага твора | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| Ці знаў хто з вас, браткі, Тараса, / Што палясоўшчыкам служыў? | | | |
| Душой стаміўшыся ў жыццёвых цяжкіх бурах… | | | |
| Стаміліся белыя коні і цёмныя сталі ад поту… | | | |
| Ад прадзедаў спакон вякоў… | | | |

**Прыклады заканчэння мастацкага твора:**

**1.** Ехаў Скарына Францыск друкаваць свае кнігі дома. / Цілімкалі / Весела / Бомы…

**2.** Мы клянёмся табе, што ніколі, / Ніколі, / Ніколі, / Так, / Ніколі не кінем, / Не кінем, / Не кінем цябе.

**3.** Ён гэта мне апавядаў, / А я ў паперку запісаў.

**4.** Перад бацькам Мінаем / станьце, ўсе бацькі, на калені!

**5.** <…>Дзе на глыбокім дне іх крыюць мора хвалі.

**6.** <…> Ўсяго Старонкай Роднаю.

**Заданне 10.** Уявіце, што перад вамі пашкоджаны рукапіс аднаго з самых вядомых вершаў беларускай літаратуры. Прачытайце тое, што захавалася, і запоўніце табліцу.

**Заўвага:** Улічыце, што [нрзб] – «неразборліва»; абазначэнне кавалка тэксту, які цяжка прачытаць.

*Максімальная колькасць балаў – 3.*

Паміж ……………………

………………… Ніла,

Зарука ў тым – трэск карабля,
Што сеў на скалы ў змрочным моры.
Прывет, жаданая зямля!
І бестрывожна бачаць зоры,
Як тонуць людзі з карабля.

*Максім Багдановіч, 1912*

Гэты твор адносіцца да … ______________________________, бо ______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________

УРЫВАК З НІБЫ-ПАЭМЫ «ГВАЛТ НАД ФОРМАЙ»

Мы ўчора былі толькі галы:
Шукалі папараць Купалы.
А сёння мы, уцекачы,
Завострым вострыя мячы –
Сячы ўсе формы.
І крычы!
Мы толькі рытмам, маршам цвёрдым,
З паглядам жудасным і гордым,
Без формы-вопраткі
У свет!
Усе сцягі – пад ногі;
Мы – богі!
Убогія богі!
Дык кіньма хоць след!
Навука, гульня, канстытуцыя
І нават сама –
Рэвалюцыя, –
Усё гэта трэба нам!
Не панам!
Мне!

*Міхайла Грамыка, 1922*

Гэты твор адносіцца да … ______________________________, бо ______________________________
______________________________
______________________________
______________________________
______________________________

**Заданне 9.** У табліцы змешчаны пачаткі пэўных мастацкіх твораў. Запоўніце табліцу, запісаўшы ў адпаведнай графе нумары іх заканчэння са спіса, а таксама назвы гэтых твораў і іх аўтараў.

**Увага!** У спісе ёсць «лішнія» цытаты, якія не з'яўляюцца заканчэннем указаных у табліцы твораў.



______________________________
______________________________
______________________________
______________________________

**Заданне 4.** *«Жыццё – гасцінец, гады – як вёрсты»* (А. Гарун). Гістарычна ў слов *гасцінец* вылучаюцца два суфіксы (*гасц-ін-ец-*□), бо этымалагічна яно звязана са слова *госці* ў значэнні *'багатыя купцы'*. Аднак сёння ў марфемным слоўніку структура слов *гасцінец* зафіксавана як непадзельная. Гэта толькі адзін з прыкладаў, калі з цягам часу слов змяніла сваю марфемную будову.

Вызначце і запішыце ў табліцу сучасны марфемны склад прапанаваных слоў.

*Максімальная колькасць балаў – 5* (1 бал за кожнае правільна разабранае слова

| Гістарычны падзел слова на марфемы | Сучасны падзел слова на марфемы |
|---|---|
| **Узор:** *гасц-ін-ец-*□ | *гасцінец-*□ |
| чатыр-на-ццаць-□ | |
| па-нядзел-ак-□ | |
| у-до-сыць | |
| па-рэч-к-а | |
| не-на-відз-е-ць | |

**Заданне 5.** Уявіце, што падчас вашай працы з электронным варыянта *«Граматычнага слоўніка дзеяслова»* адбыўся збой у праграме. Аднавіце граматычны формы дзеясловаў у слоўнікавых артыкулах.

**Узор:**

**вы́сушыць** зак., *што* вы́сушу, высушыш, высушыць, высушым, высушыц высушаць; высушы, ______________ (?); высушыў, высушыла, высушылі; высушань ______________ (?)

**вы́сушыць** зак., *што* вы́сушу, вы́сушыш, вы́сушыць, вы́сушым, вы́сушыц вы́сушаць; вы́сушы, **вы́сушыце**; вы́сушыў, вы́сушыла, вы́сушылі; вы́сушань **вы́сушыўшы.**

*Максімальная колькасць балаў – 6* (0,5 бала за кожную правільна запісаную форму

**акрылі́ць** *зак., каго* акрылю́, акрылі́ш, акрылі́ць, ______________ (?), акрыліце ______________ (?); акрылі́, акрылі́це; акрылі́ў, акрылі́ла, акрылі́лі; ______________ (? акрылі́ўшы;

**сцерагчы́ся** *незак.* сцерагу́ся, сцеражэшся, сцеражэцца, ______________ (? сцеражацёся, сцерагу́цца; сцеражы́ся, сцеражы́цеся; ______________ (?), сцераглася сцераглося, сцераглі́ся; ______________ (?);

**настояць** *зак., чаго-што* (*зрабіць настой*) настою, настоіш, настоіць, настоім ______________ (?), настояць; настой, настойце; настояў, ______________ (? настоялі; настоены, ______________ (?);

**малоць** *незак., што і без дап.* мялю́, ме́леш, меле, ме́лем, ____________ (?), ме́люць; мялі́, мялі́це; малоў, малола, малолі; ____________ (?); ____________ (?).

**Заданне 6.** Прачытайце выказванні беларускіх пісьменнікаў. Вызначце, якой часцінай мовы з'яўляецца слова ***як*** і якую функцыю яно выконвае ў сказе.

*Максімальная колькасць балаў – 4* (0,5 бала за вызначэнне часціны мовы, 0,5 бала за вызначэнне функцыі ў сказе).

1. ***Як*** выказаць цябе, маё маўчанне? (*А. Разанаў*).
2. ***Як*** мы жывём, так нам жывецца (*З. Дудзюк*).
3. Толькі страціўшы Радзіму, будзеш, ***як*** камень, сляпы, і глухі, і нямы (*М. Танк*).
4. ***Як*** хутка ўсё мінае і становіцца гісторыяй! (*М. Танк*).

| Часціна мовы | Функцыя ў сказе |
|---|---|
| 1. | |
| 2. | |
| 3. | |
| 4. | |

**Заданне 7.** Перакладзеныя на беларускую мову электронным перакладчыкам афарызмы патрабуюць дадатковага рэдагавання. Знайдзіце ў кожным з іх памылку, замяніце правільнай формай, якая адпавядае сутнасці арыгінальнага суджэння.

Растлумачце прычыну памылак, якія дапускае электронны перакладчык.

*Максімальная колькасць балаў – 5.*

1) Утварэнне – гэта ўсё. Персік быў калісьці горкім міндалём, а квяцістая капуста – гэта звычайная капуста, якая атрымала вышэйшую адукацыю (*М. Твен*).

2) Бескарыснасць – адна з самых пахвальных дабрачыннасцей, што спараджае добрую славу (*М. Сервантэс*).

3) У гэтым свеце карысць прыносіць кожны, хто палягчае бярэмя іншага чалавека (*Ч. Дыкенс*)



4) Эгаізм шчаслівых людзей – бяспечны, павярхоўны і несвядомы. Эгаізм няшчасных людзей – бязлітасны, горкі і перакананы ў сваёй праваце (*М. Эбнер-Эшэнбах*).

Прычына памылак:

**Заданне 8.** Мадэрнізм – агульная назва шэрагу напрамкаў (*сімвалізм, імпрэсіянізм, экспрэсіянізм, футурызм* і інш.), якія парываюць з традыцыямі XIX ст., з рэалізмам і выяўляюць суб'ектывісцкае, індывідуалістычнае светабачанне.

Уважліва прачытайце прыведзеныя ніжэй паэтычныя творы і вызначце, да якога напрамку мадэрнізму іх можна аднесці. Адказ павінен быць адназначным. Патлумачце 1–2 сказамі, чаму Вы аднеслі твор да таго ці іншага напрамку.

*Максімальная колькасць балаў – 6.*

НОЧ ЗА НОЧКАЙ…

Ноч за ночкай ідзе, сціпша, тайна брыдзе,
Рассявае трывогу-знямогу;
Цені густа кладзе на пяску, на вадзе,
Ацямрае гасцінец-дарогу.

І урок, і залом абымае крылом,
Груганоўым крылом спавівае;
Водзіць рэй з ведзьмаком, жэніць ведзьму з ваўком,
Кажана і саву заручае.

З ям вылазіць, як лунь, Вадзянік і Лясун,
Выпраўляюць русалкі бяседу;
Змей дабро цягне з пунь, пакуль крыкне пявун,
Пакуль поўнач не зробіць прагледу.

Неба свой нямы сход: месяц, зор харавод
Над зямлю то выводзіць, то зводзіць;
Спіць сяло, дрэмле кот, вецер цісненца ў плот,
Як на дудках, у шчэпках заводзіць.

Так ноч ночку вядзе, сціпша, тайна брыдзе,
Рассявае трывогу-знямогу;
Цені густа кладзе на пяску, на вадзе,
Ацямрае гасцінец-дарогу.

*Янка Купала, 1909*

Гэты твор адносіцца да … ____________, бо

***

Мы доўга плылі ў бурным моры,
І ўраз – жаданая зямля!
Вы пэўны пуць казалі, зоры,